## *Прапануем прачытаць:*

1. Барадулін, Р.І. Калі рукаюцца душы : Паэзія з прозай / Р.І.Барадулін,В.В.Быкаў.- Мн. : Кніга, 2003
2. Барадулін, Р.І. Адам і Ева : Лірыка / Р.І.Барадулін.- Мн. : Беларусь, 1968
3. Барадулін, Р.І. Амплітуда смеласці : І лірыка, і гумар / Р.І.Барадулін.- Мн. : Маст. літ., 1983
4. Барадулін, Р. Ксты [Тэкст] / Рыгор Барадулін ; уклад. У. Завальнюк. - Мінск : Рым.-Катал.парафія св. Сымона і св. Алены, 2009
5. Барадулін, Р. Прынамсі... : Вяселыя вершы, закаханы гумар, пародыі, эпіграмы / Р.Барадулін
6. Барадулін, Р.І. Самота паломніцтва : Кн. паэзіі / Р.І.Барадулін.- Мн. : Маст. літ., 1989



















**ДУК ”Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“**

# *Да людзей з любоўю ідучы…*



# Рыгор Іванавіч Барадулін

*24 лютага – 90 гадоў з дня нараджэння*

**Докшыцы**
**2025**

# Рыгор Іванавіч Барадулін

Нарадзіўся 24 лютага 1935 года на хутары Верасоўка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі паэт, эсэіст і перакладчык.

Пасля вайны Рыгор Барадулін вучыўся ва Ушацкай сярэдняй школе (скончыў у 1954 г.), затым на філалагічным факультэце БДУ (скончыў у 1959г.).

Працаваў рэдактарам у розных перыядычных выданнях: газеце ”Советская Белоруссия“, часопісах ”Бярозка“, ”Полымя“, а таксама ў выдавецтвах ”Беларусь“ (з 1969 г.), ”Мастацкая літаратура“ (з 1972 г.).

У складзе дзяржаўнай дэлегацыі БССР прымаў удзел у 39-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1984 г.).

Рыгор Барадулін быў актыўным членам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Памёр 2 сакавіка 2014 года.

# Творчасць Рыгора Барадуліна

Пачаў публікавацца ў 1953 годзе, першыя вершы былі надрукаваны ў газеце ”Чырвоная змена“. Першы зборнік паэзіі ”Маладзік над стэпам“ выйшаў у 1959 годзе. Усяго выйшла каля 70 зборнікаў паэзіі (сярод іх ёсць зборнікі сатыры і гумару, а таксама вершы для дзяцей), крытычных артыкулаў, эсэ, перакладаў. Двойчы выдаваліся кнігі выбраных вершаў паэта (1984, 1996-2002).

Рыгору Барадуліну належыць і значная колькасць вершаваных перакладаў на беларускую мову, у т. л. ”Слова пра паход Ігараў“ (1986), кніг Федэрыка Гарсія Лоркі (”Блакітны звон Грэнады“, 1975), Габрыэлы Містраль (”Ветраліст“, 1984) і іншыя.

Летам 2006 года выйшла кніга выбраных вершаў Барадуліна ”Руны Перуновы“.

# Мы – беларусы...

Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы,
Мы, беларусы,
Мы – народ такі.
Ахвотна забываем, што мы,
Хто мы.
Згадаюць
Нашай памяці вякі!

Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы,
Саміх сябе хваліць нам не з рукі.
Хай слабакі
Аж падаюць ад стомы,
На плечы ўзяўшы
Пыхі мех цяжкі.

Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І госць, і падарожны ў нас
Як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.

Гатовы ўсё аддаць –
І тым багаты,
Мы, беларусы,
Мы – народ такі.
Што з краю небяспекі нашы хаты.
Пра гэта
Не забудуць чужакі!